# ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

## НА ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ПРЫ БЕЛАРУСКІМ ТЭХНАЛАГІЧЫМ ІНСТЫТУЦЕ НА 1993/94 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД.

1. На падрыхтоўчае аддзяленне па выніках субяседавання прымаюцца жыхары рэспублікі (уключаючы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі рэспублікі), маючыя сярэднюю адукацыю.

2. Асобы, паступаючыя на падрыхтоўчае аддзяленне, прадстаўляюць заяву на імя рэктара, накіраванне на падрыхтоўчае аддзяленне вызначанай формы (пры адсутнасці накіравання пытанне аб прыёме дакументаў вырашае ВНУ), дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), пры наяўнасці копію працоўнай кніжкі, 6 фотакартак памерам 3×4, медыцынскую даведку. Пашпарт і іншыя дакументы прад'яўляюцца асабіста.

3. Дакументы на дзённае аддзяленне прымаюцца з 1 верасня па 20 лістапада, на завочнае — з 1 верасня па 10 кастрычніка.

4. Навучанне на падрыхтоўчым аддзяленні платнае. Грашовы ўзнос могуць уносіць прадпрыемствы, калгасы, саўгасы, фірмы, кааператывы, альбо самі паступаючыя.

Наш разліковы рахунак № 609038 у Ленінскім аддзяленні Белбізнесбанка г. Мінска МФО 400268, код 153001763.

5. Поўнасцю ад аплаты за навучанне на падрыхтоўчым аддзяленні вызваляюцца і па выніках субяседавання ў першачарговым парадку залічваюцца: ваеннаслужачыя, звольненыя ў запас, якія карыстаюцца ўстаноўленымі льготамі; дзеці-сіроты, што засталіся без апекі бацькоў; інваліды I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыкарэабілітацыйных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі; асобы, маючыя льготы ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС»; асобы, у якіх бацька і маці інваліды II групы, альбо адзін з бацькоў інвалід I групы; дзеці ваеннаслужачых, загінуўшых пры выкананні інтэрнацыянальнага доўгу. Пры гэтым, слухачам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, дзяцей ваеннаслужачых, загінуўшых пры выкананні інтэрнацыянальнага доўгу, якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, выплачваецца стыпендыя.

6. Накіраванне камандавання воінскіх часцей дзейнічае на працягу года з дня звальнення вайскоўца ў запас.

7. З усімі паступаючымі праводзіцца субяседаванне па матэматыцы і фізіцы, альбо матэматыцы і хіміі ў залежнасці ад выбранай спецыяльнасці.

8. Пачатак заняткаў на завочным аддзяленні 15 кастрычніка, на дзённым аддзяленні — 1 снежня.

9. Слухачам дзённага падрыхтоўчага аддзялення прадастаўляецца інтэрнат на ўмовах, якія вызначаны для студэнтаў.

10. Па заканчэнні курса навучання слухачы падрыхтоўчага аддзялення здаюць выпускныя экзамены. Пералік выпускных экзаменаў адпавядае пераліку ўступных экзаменаў. Выпускныя экзамены прымае прыёмная камісія.

11. Слухачы, якія сістэматычна парушалі вучэбную дысцыпліну, правілы ўнутранага распарадку і не выконвалі вучэбны план, выключаюцца з падрыхтоўчага аддзялення загадам рэктара ВНУ.

12. Даведкі можна атрымаць па адрасу: 220630, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13-а, корпус № 1, пакой № 327, падрыхтоўчае аддзяленне. тэлефон: 27-73-89.

РЭКТАРАТ.

# *Выйшлі з друку...*

Для студэнтаў лесатэхнічных спецыяльнасцей можам паведаміць прыемную навіну. У выдавецтве «Экология» (Масква) выйшлі з друку дзве цікавыя працы: «Справочник мастера лесозаготовок» і «Заготовка сортиментов на лесосеке» (технология и машины).

Аўтары даведніка — выкладчыкі нашага інстытута А. П. Матвейка, А. С. Федарэнчык і Г. І. Завойскіх падрабязна тлумачаць правы і абавязкі майстра лесанарыхтовак, расказваюць аб парадку адводу і прыёмкі лесасечнага фонду, аб падрыхтоўчых і дапаможных работах, аб машынах, якія выкарыстоўваюцца для іх выканання.

Разгледжаны асноўныя работы на лесасецы, лесанарыхтоўчая тэхніка.

Для спецыялістаў-лесатэхнікаў, не сакрэт, вызначаныя цяжкасці заўсёды ўяўлялі пытанні працы і аплаты на лесасечных работах. У параграфе 5 падрабязна і зразумела расказана аб планаванні аб'ёмаў вытворчасці па перыядах года, аб формах брыгаднай арганізацыі працы і арганізацыі вахтавых метадаў працы на лесасечных работах. А таксама даецца матэрыял аб арганізацыі брыгаднага і арэнднага падраду на лесанарыхтоўках.

Падрабязна асвечаны пытанні тэхнічнага абслугоўвання і бягучага рамонту лесанарыхтоўчай тэхнікі.

Каштоўны матэрыял сабраны таксама па ўліку і захаванню драўніны на майстравым участку.

Вас цікавяць пытанні лесааднаўлення? Калі ласка. Адказы вы знойдзеце ў гэтым даведніку. Таму цікавасць ён уяўляе і для студэнтаў і выкладчыкаў лесагаспадарчага факультэта.

Даведнік без перабольшання стане «настольнай кнігай» майстроў лесанарыхтовак, інжынерна-тэхнічных работнікаў лесанарыхтоўчых прадпрыемстваў і студэнтаў лесатэхнічных ВНУ і тэхнікумаў.

У апошнія гады лесанарыхтоўшчыкі праяўляюць павышаны інтарэс да тэхналогіі і мабільных машын для нарыхтоўкі сартыментаў у лесе.

Укараненне сартыментнай тэхналогіі дазваляе істотна павялічыць долю драўніны, нарыхтаванай ад рубак догляду, скараціць выдаткі на догляд за лесам.

Свой эфект сартыментная нарыхтоўка драўніны ў лесе дае і на рубках галоўнага карыстання. Упершыню комплексная адзнака тэхналагічных варыянтаў лесанарыхтовак і асноўных фактараў, што ўплываюць на працу лесанарыхтоўчых і пад'ёмнатранспартных машын, даецца яшчэ ў адным цікавым выданні таго ж выдавецтва «Экология» — «Заготовка сортиментов на лесосеке». Аўтары — А. В. Жукаў, І. К. Іевінь, А. С. Федарэнчык і Ю. І. Праватараў.

Галоўныя думкі, выкладзеныя ў гэтай манаграфіі, тычацца выкарыстання сістэм машын на лесанарыхтоўках з мінімальнай шкодай для навакольнага асяроддзя, больш поўным выкарыстаннем лесасыравінных рэсурсаў і павышэння эфектыўнасці лесанарыхтовак.

Асноўныя пытанні асвечаны А. В. Жукавым і А. С. Федарэнчыкам.

Манаграфія накіравана на рашэнне навучальных і вытворчых пытанняў. А разлічана — на інжынерна-тэхнічных работнікаў лясной прамысловасці і студэнтаў лесатэхнічных і лесагаспадарчых спецыяльнасцей ВНУ.

*30 сентября Владимиру Васильевичу Печковскому исполнилось бы 70 лет...*

# ЖЫЎ ШЧЫРА, ЯРКА, ПАЛЫМЯНА...



30 сентября Владимиру Васильевичу Печковскому исполнилось бы 70 лет...

Молодым профессором, доктором технических наук приехал Владимир Васильевич в 1964 году в Минск, чтобы организовать в республике подготовку инженеров-химиков-технологов по специальности технология неорганических веществ. В то время в Белоруссии росла и крепла химическая промышленность. В Гомеле, Гродно, Солигорске возводились крупные химические предприятия по производству минеральных удобрений, кислот, солей.

У В. В. Печковского был большой опыт подготовки специалистов по технологии неорганических веществ: он с отличием закончил Ленинградский технологический институт по специальности ТНВ, по этой же специальности обучался в аспирантуре, защитил кандидатскую и докторскую диссертации, работал доцентом и заведующим кафедрой технологии неорганических веществ в Новочеркасском и Пермском политехнических институтах.

В. В. Печковский со свойственной ему энергией и энтузиазмом взялся за организацию новой специальности в БТИ. Было много трудностей, забот. Необходимо было создать научно-техническую материальную базу кафедры, квалифицированный научно-педагогический коллектив, учебные и научно-исследовательские лаборатории. Но проницателен и мудр был этот человек. Уже через 2—3 года после основания кафедры она была одной из лучших в институте: при ней функционировала аспирантура, отраслевая лаборатория, выполнялись хоздоговорные работы, осуществлялся выпуск инженеров-химиков-технологов. В стенах кафедры рождались интересные научные идеи, выкристаллизовывалась научная тематика.

Научная интуиция, глубокий профессионализм Владимира Васильевича помогли ему безошибочно определить основное научное направление кафедры, связанное с разработкой научных основ технологии фосфорсодержащих соединений и материалов на их основе. Актуальность научных работ, выполняемых на кафедре, стала основанием для открытия проблемной лаборатории. Все годы под руководством В. В. Печковского коллектив проблемной лаборатории целенаправленно трудился над созданием новых фосфатных материалов и их технологий. Получены десятки авторских свидетельств, изданы монографии, опубликованы сотни статей. По материалам исследований защищено 40 кандидатских и 6 докторских диссертаций. Имя заслуженного деятеля науки и техники Белоруссии, профессора В. В. Печковского известно во всех научных лабораториях мира, ведущих исследования в области химии и технологии соединений фосфора.

Владимир Васильевич был требователен и строг к своим ученикам, высоко ценил целеустремленность, научную эрудицию. В то же время он был добрым советчиком, внимательным собеседником, отзывчивым человеком, под власть обаяния которого подпадали все, кто его знал. Он умел зажигать идеей, вдохновлять своим оптимизмом, был смел и неутомим в научном поиске.

Можно много писать о В. В. Печковском, как об ученом, научном руководителе, учителе, но нельзя не сказать о нем, как о преподавателе, педагоге. Большое значение придавал он педагогическому мастерству и отмечал это при оценке преподавателя. Совершенствование учебного процесса, его организация всегда были постоянной заботой В. В. Печковского. Созданные совместно с преподавателями кафедры учебники и учебные пособия являются базой обучения многих поколений студентов.

Владимир Васильевич глубоко вникал в студенческую жизнь, был частым гостем на кураторских часах, много общался со студентами, воспитывал у них чувство гордости за выбранную ими специальность. В. В. Печковский уважительно, с любовью относился к студенческой молодежи, и она отвечала ему взаимностью. Тепло и щедрость, интеллигентность всегда были в нем, как его сердце, ум и добрые, пронзительные, ласковые глаза.

Прошло более четырех лет, как нет среди нас Владимира Васильевича. Но он остался в каждом из тех, кто работал с ним, учился у него. Нам дорога память о нем, и мы стремимся быть достойными его.

Предадимся грусти воспоминаний об этом прекрасном человеке, о красоте его светлой души, любящей людей и жизнь, о сильной личности, созидающей вокруг себя поле мощного притяжения.

**Сотрудники кафедры ТНВ и ОХТ.**

# ...І СЛЕД ПАКІНУЎ НА ЗЯМЛІ

Мне прыкра, што пры жыцці не паспела сказаць гэтаму чалавеку шчырыя словы падзякі. Бо Ўладзімір Васільевіч быў не толькі сябрам і дарадчыкам нашай газеты, але асабіста для мяне — яшчэ не надта сталага журналіста — ён быў настаўнікам у агульначалавечым сэнсе гэтага слова. І калі іншым я здавалася проста добразычлівай, ветлівай «даяўчынкай з рэдакцыі», то менавіта Ўладзімір Васільевіч першы разглядзеў за знешняй прастатой творчую працу думкі, схільнасці да аналізу падзей і ўчынкаў. Менавіта ён падказаў мне сур'ёзна заняцца псіхалогіяй, вучыў разумець людзей. Пры ўсей сваёй занятасці ён з задавальненнем удзяляў увагу, калі звярталася да яго за парадай.

Зараз я магу са ўсёй шчырасцю ацаніць яго педагагічны такт. Ён умеў, як ніхто іншы, накіраваць твае дзеянні ў патрэбнае рэчышча. «Вы разумны чалавек» — падкрэсліваў ён. І я не мела перад сабой права зрабіць нешта не адпаведнае гэтай высокай ацэнцы. Хоць і разумела, што гэта — вялікі аванс.

«Вы чалавек думаючы». І я думала, шукала, сядзела дапазна над падручнікамі і кнігамі. Я расла як асоба пад пільным яго вокам. А ён — то між іншым прынясе часопіс з цікавым артыкулам, то выразку з газеты, а затым абавязкова спытаецца тваёй думкі. Як шчыра, добра свяціліся яго блакітныя вочы, калі я самастойна выказвала свае меркаванні. Калі спрачалася і не згаджалася з ім — ён разумеў: маладосць — гэта не недахоп. Яна праходзіць. Ён шчыра выбачаў недахопы, але пільна сачыў, каб не перараслі яны ў памылкі. Гэта адзіны чалавек, якому я прызналася, што пішу вершы. І прачытаўшы іх, ён сказаў: «У вас вялікая душа і шчырае сэрца, вы ўмееце бачыць жыццё». Тады я па маладосці засяродзіла ўвагу толькі на першай частцы фразы і была вельмі гордай і шчаслівай. А галоўнае — «умець бачыць жыццё» — прыйшло значна пазней.

Гэта быў чалавек, які ніколі не кпіў і не здзекваўся з пачуццяў іншых людзей. Ён умеў цаніць усё сапраўднае. Ён любіў жыццё. А ў ім — усіх нас. Хоць можа з іншымі і не знаходзіў паразумення...

Ён быў разумным, шчырым і добрым. Мне наогул шчасціць на добрых людзей, у якіх ёсць чаму павучыцца, якія разумеюць мяне і дапамагаюць расці інтэлектуальна, бо самі неардынарныя і вельмі цікавыя. Я ім удзячна. І ўжо не мінаю сказаць гэта ўслых. Бо аднойчы спазнілася... Уладзімір Васільевіч не пачуў ад мяне тых слоў захаплення, якія жылі ў душы, бо было няёмка сказаць прама ў вочы: «Вы выдатны чалавек! Дзякую за жыццёвую навуку!» Думалася: некалі, як будзе старэнькі, вазьму кветкі, торт і абавязкова прыеду...

Пішу я гэтыя радкі толькі таму, каб усе мы не спазніліся аддзячыць адзін аднаму за дабро, каб умелі яго цаніць і адказваць той жа шчырасцю, але своечасова...

І яшчэ. Хачу каб усе мы зразумелі, што жыць трэба так, каб пра нас шчыра ўспаміналі нават «потым». Уладзімір Васільевіч гэтага дасягнуў.

Т. ФЕДАРЦОВА.